Анатоль Вярцінскі



# Жыццё хвалюе і трывожыць...

**Паэт, драматург, публіцыст, крытык, перакладчык, член Саюза пісьменнікаў Беларусі**

Адна з колішніх літаратурных сустрэч запомнілася тым, што ў час яе цікава выступіла выкладчыца Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў кандыдат педагагічных навук Лілія Адамаўна Дзямешка. Яна падзялілася сваімі меркаваннямі, сваім досведам і арыгінальна закончыла выступленне – чытаннем уласнага верша. Потым паказала свае іншыя вершы. Смеючыся, сказала, што ці не праяўляецца творчы ген па матчынай лініі, бо яе маці, Яўгенія Міхайлаўна Беразоўская, настаўніца па прафесіі, – вядомая на Уздзеншчыне паэтка друкуецца ў мясцовай газеце, змяшчае вершы ў калектыўных зборніках уздзенскіх аўтараў.

Прайшло з часу той сустрэчы некалькі гадоў. Лілія Адамаўна стала шматвопытным спецыялістам у бібліятэчнай справе, прайшла шлях ад выкладчыка да прафесара і з'яўляецца прызнаным аўтарытэтам у галіне навукова-педагагічнай дзейнасці. І, што яшчэ характэрна, і што мне як паэту асабліва прыемна адзначыць, – піша вершы. Пры ўсёй сваёй занятасці: працуе над манаграфічнымі і навукова-практычнымі выданнямі, над вучэбнымі і метадычнымі дапаможнікамі, кіруе кандыдацкімі, магістарскімі і дыпломнымі працамі. І ў той жа час прафесар Лілія Дзямешка, аддадзім ёй належнае, – знаходзіць магчымасць пісаць вершы, працаваць яшчэ і над паэтычным радком.

І гэта для яе – не хобі, не аматарская забава, а патрэба душы. У чым я пераканаўся, знаёмячыся з рукапісам кнігі вершаў Ліліі Дзямешкі «Мне жыццё ўяўляецца полем...». У кнізе ёсць нават асобны раздзел, які так і называецца: «Дапамажыце, вершы, мне».

Дапамажыце, вершы, мне.
Без вашай ласкі, без натхнення
Я не змагу адолець, не,
Душы сваёй акамянення.
Дапамажыце, вершы, мне.
Патрэбна ваша мне падмога.
Звяртаюся я, як да Бога:
Дапамажыце, вершы, мне.

І ў іншых сваіх вершах Л.А. Дзямешка прызнаецца, што яны для яе – гэта і «лепшае багацце», і «скарб», і цудадзейны сродак мяняць жыццё да лепшага:

Каб памяншалі колькасць злаславых,
Каб павялічвалі лік шчаслівых.

Зборнік складаюць розныя ў жанрава-тэматычных адносінах вершы. Ды адметную танальнасць іх вызначаюць такія якасці, як павышаная эмацыйнасць, непасрэднасць лірычнага пачуцця – пачуцця Радзімы, роднага краю, пачуцця кахання і сяброўства, пачуцця адказнасці за лёс сваіх блізкіх, роднай мовы, усяго жывога на Зямлі.

Жадаю першай кнізе Ліліі Дзямешкі прыемных сустрэч з чытачом.

*Красавік 2012* *Анатоль Вярцінскі*

Пераконваў нас класік –
мудры Янка Купала,
Што настане дзень беларускай мовы.
Сумняваўся ў гэтым прароцтве
таксама мудры Пімен Панчанка,
Маючы на ўвазе
нашую горкую штодзённасць.
Ды ёсць волаты, што
верна служаць Айчыне.
Таму верыцца:
родная мова не згіне!

***

Нашу мову любіць
Памагае нам любасць
Да бярозак, вясёлак,
Да добрых людзей,
Да Радзімы нашай цярплівай,
Шматпакутнай нашай Радзімы,
Што не траціць ніколі
На лепшую долю надзей.

***

Жыццё ідзе канвеерам,
То прама, а то веерам,
Ідзе, бяжыць, спяшыць...
Дык як жа ўсё-ткі жыць?

Вось гэтак па канвееры?
Лепш прама, а ці веерам?
Давай паверым разам,
Што можна лепей жыць.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ